ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

ЧАЦВЕР
30 верасня
1993 года
№ 13(1700)

ПРАЦОЎНЫ ДЭСАНТ

ВОСЬ І МЕСЯЦ ПРАЙШОЎ. «БУЛЬБЫ» ЯК НЕ БЫЛО

Сёлетні «бульбяны» сезон значна адрозніваецца ад мінулагодніх. Раней як было? Два-тры курсы кожнага факультэта на пачатку верасня ў арганізаваным парадку ад'язджалі на вёску. Кожная няяўка па няўважлівай прычыне лічылася надзвычайным здарэннем факультэцкага маштабу з усімі выцякаючымі адсюль вынікамі. Хвалявaліся кіраўнікі гаспадарак, абураліся дэканы... І вось, нарэшце, усеагульная нервовасць змянілася спакоем і дзелавітасцю.

Спачатку Аблаграпрам падаў універсітэту заяўку на 1500 студэнтаў-«калгаснікаў». Аднак, паразважаўшы, удакладніўшы ў кіраўнікоў гаспадарак, лічбу знізілі да 700. Скажам, у Нясвіжскім раёне меркавалі адразу прыняць 500 студэнтаў, але прааналізаваўшы больш дакладна свае магчымасці і патрэбу ў дадатковай працоўнай сіле, заказалі толькі 100. Што ж, капейка рубель хавае. На «месцах» сёння адмовіліся ад штогадовай традыцыі на ўсялякі выпадак клікаць на дапамогу ўдвая больш памочнікаў, чым патрэбна, а прымаць столькі студэнтаў, колькі прышлюць. Перасталі яны быць дармовай працоўнай сілай: забяспечыць студэнтаў жыллём, арганізаваць іх перавозку да месца працы і пасля заканчэння ўборкі да плошчы Незалежнасці — усё гэта каштуе немалыя грошы. Да таго ж, за кожную прынятую групу на рахунак навучальнай установы, якая прадаставіла працоўную групу, павінна быць пералічана 35 тысяч рублёў. Калі справы і далей пойдуць у такім накірунку, то, магчыма, у наступным годзе студэнты наогул забудуцца пра існаванне «бульбы».

Пакуль жа па рашэнню кіраўнўцтва універсітэта на палетках падшэфных гаспадарак працуюць толькі студэнты другіх курсаў, выключаючы, праўда, навучэнцаў факультэта радыёфізікі і электронікі, прыкладной матэматыкі і інфарматыкі, фізічнага і філасофска-эканамічнага, якія былі пакінуты ў рэзерве. Да таго ж, і на астатніх факультэтах на месяц адклалі пачатак навучальнага года нават не ўсе патокі.

Яшчэ адна цікавая акалічнасць: упершыню ні рэктарская камісія, ні факультэцкія не зрабілі ніводнага праверачнага выезду на раён. Прычына банальная — недахоп паліва. Хочацца верыць, што ў гаспадарках яго ўсё ж дастаткова, каб не давялося студэнтам дабірацца да альма-матэр пехам.

Аляксандр ЮРЫН.

◆◆◆◆◆

ДАРЭЧЫ...

1 кастрычніка ў 11 гадзін з плошчы Незалежнасці яшчэ каля 280 студэнтаў нашага універсітэта адправяцца ў гаспадаркі Мядзельскага раёна Мінскай вобласці. На два тыдні. Пра гэта нам паведаміў Анатоль Мікалаевіч Баранаў, намеснік начальніка вучэбна-метадычнага аддзела.

Паедуць студэнты другога курса трох факультэтаў — прыкладной матэматыкі і інфарматыкі, фізічнага, філасофска-эканамічнага. Яшчэ адзін факультэт застаўся ў рэзерве — радыёфізікі і электронікі. Але наступным годам яны паедуць на палі гаспадарак першымі.

РЭКТАРАТ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА УНІВЕРСІТЭТА

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад

ЗАГАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: агульнай матэматыкі; дыферэнцыяльных ураўнаванняў; геаметрыі, тапалогіі і методыкі выкладання матэматыкі; генетыкі і біятэхналогіі (доктар навук); гісторыі старажытнага свету і сярэднявечча;

ПРАФЕСАРА КАФЕДРЫ арганічнай хіміі і хіміі высокамалекулярных злучэнняў;

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ:эканамічнай тэорыі; філасофіі і метадалогіі навукі; тэарэтычнай фізікі; вышэйшай матэматыкі і матэматычнай фізікі; фізікі паўправаднікоў; інфарматыкі; тэарэтычнай механікі і робататэхнікі; функцыянальнага аналізу; лікавых метадаў і праграміравання; метадаў аптымальнага кіравання; інфармацыйнага і праграмна-матэматычнага забеспячэння аўтаматызаваных вытворчасцей; матэматычнага забеспячэння ЭВМ; арганічнай хіміі і хіміі высокамалекулярных злучэнняў; неарганічнай хіміі; тэорыі і гісторыі літаратуры; паліталогіі;

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: агульнай матэматыкі; тэорыі функцый; арганічнай хіміі і хіміі высокамалекулярных злучэнняў; тэорыі і гісторыі літаратуры; лікавых метадаў і праграміравання;

АСІСТЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: методыка выкладання фізікі і інфарматыкі; агульнай матэматыкі: матэматычнага забеспячэння ЭВМ.

Тэрмін конкурса — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Адрас: 220050, г. Мінск, праспект Ф. Скарыны, 4, Белдзяржуніверсітэт, аддзел кадраў, пакой 233, т. 26-59-39.

ПЕРШЫ КАНАДСКІ КЛУБ НА БЕЛАРУСІ

У сераду 13 кастрычніка ў актавай зале ў будынку гістарычнага факультэта па адрасу вул. Чырванаармейская, 6 а 19 гадзіне адбудзецца арганізацыйны сход «Канадскага клуба». Аб ім пойдзе гутарка ў інтэрв'ю з ініцыятарам стварэння «Канадскага клуба» грамадзянінам Канады і Беларусі спадаром Алесем **ПЯТРОЎСКІМ.**

— Спадар Пятроўскі, што прымусіла вас пакінуць справы ў Канадзе і заняцца стварэннем «Канадскага клуба» на Беларусі?

— Калі адказаць коратка, то амаль поўная адсутнасць на Беларусі інфармацыі аб Канадзе. «Канадскі клуб» павінен аб'яднаць людзей, якія жадаюць прыняць удзел у развіцці адносін паміж гэтымі краінамі і маюць для гэтага здольнасці і магчымасці. Без ведання англійскай ці французскай мовы ўдзел у рабоце клуба будзе вельмі абмежаваным.

— Калі можна, падрабязней аб тым, чым будзе займацца ваш клуб.

— Адна з практычных мэтаў клуба — стварэнне канадскага інфармацыйна-аналітычнага Цэнтра. У межах вучэбнай праграмы студэнты атрымаюць магчымасці пісаць свае курсавыя і лабараторныя работы на аснове жывога матэрыяла аб Канадзе. У Беларусі не выпісваецца ні адзін канадскі часопіс, ні адна газета, геаграфічны факультэт нават не мае падрабязнай карты Канады. «Канадскі клуб» будзе весці актыўную перапіску і звяртацца за інфармацыяй непасрэдна ў Канаду. Для ўсіх, хто цікавіцца гэтай краінай, студэнцкія даследванні будуць добрай крыніцай інфармацыі.

— А на якой стадыі знаходзіцца падрыхтоўка да арганізацыі клуба?

— За 12 месяцаў знаходжання на Беларусі я меў размову з многімі людзьмі і ўпэўніўся, што зацікаўленасць у стварэнні «Канадскага клуба» ёсць. Ужо існуе дамоўленасць з рэктарам і прарэктарамі універсітэта, з дэканамі гістарычнага, геаграфічнага, філасофска-эканамічнага факультэтаў, з загадчыкамі кафедраў міжнароднага права, міжнародных адносін, палітэканоміі і палітэкалогіі, геаграфіі замежных краін. Пітэр Дж. Бейтс другі сакратар і віцэ-консул Канадскага пасольства ў асабістай размове запэўніў мяне, што калі беларусы пажадаюць да-

ШТО ТАКОЕ ФГП?

Не шукайце шчасця за блізкім светам. Лепш азірніцеся навокал: тое, што вам патрэбна, можа якраз апынуцца пад рукой. Скажам, магчымасць у дадатак да асноўнай атрымаць за студэнцкія гады яшчэ адну спецыяльнасць.

ФАКУЛЬТЭТ ГРАМАДСКІХ ПРАФЕСІЙ І ІНФАРМАЦЫЙНА-НАВУЧАЛЬНЫ ЦЭНТР «ВЕДЫ»

аб'яўляюць набор на курсы:
— польскай мовы;
— нямецкай мовы;
— стэнаграфіі і машынапісу;
— медсясцёр-касметолагаў;
— кройкі і шыцця;
— турызму.

Курсы платныя, але... Дзякуючы новым методыкам, распрацаваным выкладчыкамі, тут ўсяго толькі за адзін год вы зможаце атрымаць тыя навыкі, на авалодванне якімі ў іншых установах падобнага тыпу спатрэбяцца 3—4 гады. Тым больш, аплата за курсы амаль удвая ніжэй, чым у цэлым па горадзе.

Звяртайцеся на адрас: вул. Бабруйская, 9, 4 паверх, пакой 419 (корпус бухгалтэры). Даведкі па тэлефоне 68-70-30 з 11 да 15 гадзін.

А таксама звяртайце ўвагу на рубрыку «Беларускага універсітэта» «Што такое ФГП?» Сёння ў ёй — матэрыял «Пра новую стэнаграфію і новы машынапіс». Чытайце 3-ю старонку.

ТЭХНАПАРК — ПРЫКМЕТА ЧАСУ

Нарэшце, і ў Мінскім гарвыканкоме з'явіцца структура, якая ў маштабах горада пачне займацца праблемамі навукі і тэхнікі. Справа ў тым, што стан гарадской гаспадаркі такі, што без дапамогі вучоных і іх вынаходніцтваў не абыйсціся. Тым больш, што прыйшоў ужо час гандляваць тэхналогіямі і развіваць навукаёмісты бізнес.

Пры ўдзеле гарвыканкома, БДУ, акадэміі і фірм, з'арыентаваных на стварэнне навукаёмістай прадукцыі, ствараецца тэхнапарк, распрацоўваецца гарадская праграма інфарматызацыі.

У гэтым годзе прадугледжана фінансаванне шэрагу навукова-тэхнічных распрацовак. Да канца года будзе праведзены конкурс на лепшы навукова-тэхнічны савет.

НЕ ШАНЦУЕ

З БІЛЕТАМ ПА ЎСІМ СВЕЦЕ?

Міжнародная асацыяцыя студэнтаў, акрамя ўсяго іншага, займаецца і міжнароднымі студэнцкімі білетамі, уладальнікі якіх могуць вандраваць амаль па ўсім свеце за паўцаны.

Білет мае сілу больш чым у 70 краінах. На жаль, студэнты не могуць карыстацца гэтым правам на тэрыторыі рэспублік былога Саюза, у тым ліку і на Беларусі.

Руслан Папоў, былы старшыня прафбюро факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі, а зараз — камендант шостага інтэрната, які займаецца гэтым пытаннем на грамадскіх пачатках, лічыць, што яно не будзе вырашана на Беларусі яшчэ нейкі час, таму што галоўная ўмова такой дамоўленасці — гарантыі палітычнай стабільнасці ў краіне.

Але ж Руслан усё ж змог атрымаць для беларускіх студэнтаў у мінулым годзе каля 70 такіх білетаў, у Варшаве. Праўда, з Беларусі ў іншыя краіны студэнты будуць плаціць за квіток поўны кошт, затое назад — грошай спатрэбіцца напалову менш. Ёсць некалькі нюансаў, і ў кожнай краіне свае. Напрыклад, калі студэнт знаходзіцца ў Польшчы ці Германіі, і ведае, што ў хуткім часе прыедзе яшчэ раз у гэтую краіну, то ён мае магчымасць заказаць квіток з Беларусі ў далёкае замежжа, і заплаціць за яго ў два разы танней.

На пачатку кастрычніка Руслан ізноў пачынае збіраць дакументы, каб паехаць у Варшаву. Студэнтам, якія жадаюць атрымаць міжнародны студэнцкі білет, трэба прадставіць ксеракопію студэнцкага білета ці даведку, што ён з'яўляецца студэнтам, запоўніць анкету, прынесці фотаздымак. Дарэчы, каштуе білет 13 долараў і дзейнічае з 1 верасня бягучага года да 31 снежня наступнага. Набыць яго могуць і выкладчыкі, але за 15 долараў. А хто ўжо

СУСТРАКАЕ УНІВЕРСІТЭТ

Падрыхтоўка да міжнароднага семінара «Беларусь — Баварыя», які адбудзецца з 8 па 11 кастрычніка, працягваецца.

Універсітэт будзе сустракаць замежных гасцей: чакаецца прыезд федэральнага міністра сувязі і тэлекамунікацыі спадара Бетча, а таксама прадстаўнікоў буйнейшых фірм Баварыі і Германіі, кіраўнікоў некаторых вышэйшых навучальных устаноў.

Ужо акрэслены шэраг пытанняў, па якіх будзе весціся размова на семінары: праблемы псіхалогіі ва ўмовах жыцця пасля Чарнобыльскай аварыі, машынабудаванне і вытворчасць прадуктаў харчавання, сродкі масавай інфармацыі і тэлекамунікацыі, хімічная прамысловасць і фармакалогія, праблемы вышэйшай школы.

Як спадзяецца Віктар Генадзьевіч Шадурскі, начальнік упраўлення па міжнародных сувязях, сустрэча паспрыяе наладжванню карысных кантактаў, данамажа ў распрацоўцы новых напрамкаў супрацоўніцтва, у тым ліку і ў галіне распрацовак, якія ажыццяўляе вы-

НУ І НУ!

БІБЛІЯТЭКАРЫ МЯНЯЮЦЬ ПРАФЕСІЮ

... І ператвараюцца ў сышчыкаў.

Як мы даведаліся у аддзеле абслугоўвання, Нацыянальная бібліятэка Беларусі (былая «Ленінка») рыхтуецца да сур'ёзнай барацьбы з нядбайнымі чытачамі, якія псуюць каштоўную літаратуру — вырываюць цэлыя старонкі, і нават прысвойваюць патрэбныя экземпляры.

Мажліва, гэта звязана з лянотай студэнтаў — яны ж маюць магчымасць зрабіць у бібліятэцы ксеракопіі. Але, здаецца, гэткая паслуга не надта папулярная, таму што платная.

Бібліятэка проста вымушана была пайсці на такія значныя выдаткі — у некалькіх чытальных залах ідзе ўстаноўка назіральных кінакамер (устаноўка адной каштуе каля 600 тысяч рублёў). Канешне, наведвальніку не вельмі прыемна ад адчування, што за ім пастаянна сочаць. Але затое ў кожнай патрэбнай яму кніжцы застануцца ўсе старонкі, якія не змог «выдраць» ягоны сусед.

Дарэчы, у аддзеле абслугоўвання не надта зацікаўлены ў тым, каб распаўсюджвалася такая папераджальная інфармацыя, таму што ведаюць студэнтаў, якія знойдуць выйце хутчэй, чым з'явяцца назіральныя кінакамеры.

ШТО БАЛІЦЬ...

МЫ ВЕЛЬМІ СПАДЗЯЁМСЯ

Гэтыя словы спадзявання былі выказаны Ірынай Уладзіміраўнай Арэхоўскай, дырэктарам бібліятэкі, пасля прадстаўнічай нарады, якая адбылася ў Міністэрстве адукацыі з удзелам дырэктараў бібліятэк навучальных устаноў прадстаўнікоў Міністэрства культуры, Міністэрства інфармацыі.

Нарада праходзіла ў форме круглага стала, дзе абмяркоўваліся праблемы вузаўскіх бібліятэк: адсутнасць інфармацыі на новую літаратуру, разбурэнне наладжанай сістэмы кнігазабеспячэння, адсутнасць адзінай цаны, адсутнасць валютных асігнаванняў і іншыя.

Быў прыняты шэраг дакументаў, якія павінны спрыяць вырашэнню гэткіх складаных пытанняў. Але, галоўнае, на думку Ірыны Уладзіміраўны, гэта той высокі ўзровень, на якім пачалася размова пра патрэбы студэнцкіх бібліятэк.

ПАДАРУНАК — КНІГІ

Студэнты хімічнага факультэта яго атрымалі — у хімічным корпусе з гэтага навучальнага года пачаў дзейнічаць яшчэ адзін філіял універсітэцкай бібліятэкі.

Новая бібліятэка мае і чытальную залу, і абанемент. Дарэчы, тут будуць выконвацца і платныя паслугі, што дазваляе наяўнасць уласнай друкарскай базы. Але атрымаць ксеракопіі можна будзе толькі з літаратуры, якая складае фонд бібліятэкі.

ЗАПРАШЭННЕ

НА СУСТРЭЧУ З Л. ТАЛСТЫМ

У верасні 1993 года споўнілася 165 гадоў з дня нараджэння Льва Мікалаевіча Талстога. З гэтай нагоды аддзел рэдкай і каштоўнай кнігі бібліятэкі універсітэта падрыхтаваў выставу выданняў яго твораў.

Найбольшую каштоўнасць прадстаўляюць кнігі рэдагаваў якое П. І. Бірукоў... Сам пісьменнік, ён добра ведаў Талстога і яшчэ пры яго жыцці пачаў пісаць манументальную працу ў 4 тамах «Біяграфія Льва Мікалаевіча Талстога». Але сапраўдным шэдэўрамі выдавецкай справы лічацца пасмяротныя выданні твораў Талстога. Для гэтай працы Сыцін запрасіў самых таленавітых тыпографаў, пераплетчыкаў, мастакоў і рэдактараў. Двухтомнік «Анна Каренина» ілюстраваўся М. Шчагловым, А. Мэрававым і А. Кнорыным, твор «Воскресенье» выйшаў з малюнкамі акадэміка жывапісу Л. Пастэрнака. Асобнымі выданнямі выйшлі «Драматычныя творы», двухтомнік «Аповесці і апавяданні». Знешні выгляд усіх гэтых выданняў вельмі прывабны, надрукаваны яны на якаснай паперы, афармлены ў прыгожыя пераплёты.

У аддзеле рэдкай кнігі захоўваецца і 90-томнае юбілейнае выданне Л. М. Талстога, якое было падрыхтавана і пачало выходзіць у канцы 20 гадоў да 100-годдзя з дня нараджэння пісьменніка. Першы том выйшаў у 1928 годзе, апошні — у 1958. Нават сёння гэта самае поўнае сабранне твораў Талстога.

Усе гэтыя выданні, як і многія іншыя, бібліятэка універсітэта прапануе вашай увазе.

Л. МІЦКЕВІЧ,
загадчыца аддзела рэдкай кнігі.

Працягваецца падпіска на першы квартал 1994 года.

Часопіс «Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта» у параўнанні з іншымі рэспубліканскімі выданнямі прапануе найбольш выгадныя ўмовы падпіскі. Кошт за падпіску на часопіс па серыях такі: С. 1. — фізіка, матэматыка, механіка (інд. 74851) — 100 руб.; С. 2 — хімія, біялогія, геаграфія (інд. 74852) — 100 руб.: С. 3 — гісторыя, філасофія, паліталогія, сацыялогія, эканоміка, права (інд. 74853) — 100 руб.

РЭДАКЦЫЯ І
РЭДКАЛЕГІІ ЧАСОПІСА.

САРОКА НА ХВАСЦЕ

У Гродзенскім дзяржаўным універсітэце з новага навучальнага года пачалі займацца хлопцы і дзяўчаты з Польшчы. Чакаецца прыезд і 100 студэнтаў з Пакістана і Кітая, якія пачнуць заняткі ў кастрычніку з вывучэння рускай мовы. Сярод новых спецыялізацый, што ўведзены ў Гродзенскім універсітэце, трэба адзначыць міжнароднае прыватнае і публічнае права, менэджмент, фінансы і крэдыт. Плануецца, што часова сваю практыку і студэнты, і выкладчыкі будуць праходзіць за мяжой — у ЗША, Францыі, Германіі, Польшчы.

* * *

Горад Гомель наведала дэлегацыя вучоных з Янчжоўскага педагагічнага інстытута ў Кітаі. Госці правялі перамовы аб супрацоўніцтве з прадстаўнікамі мясцовага універсітэта імя Ф. Скарыны. Вырашана, што ў Гомель для навучання прыедуць 30 студэнтаў з Кітая.

* * *

Адзіны пакуль на Беларусі тэхнікум прадпрымальніцтва пачаў другі год сваёй гісторыі. Займаюцца тут 340 чалавек, навучанне платнае, аднак перавага пры паступленні аддаецца не ўладальнікам тоўстых кашалькоў, а здольным абітурыентам. Аб гэтым сведчыць вялікі конкурс. За першы год навучання ў тэхнікуме трэба прайсці праграму 10 і 11 класаў.

* * *

Пачатак новага навучальнага года дае падставы завесці размову аб маладзёжнай злачыннасці. Некалькі год таму асаблівую актыўнасць у гэтай вобласці праяўлялі ПТВ, але цяпер сітуацыя рэзка змянілася. Злачыннасць узрасла сярод навучэнцаў сярэдніх школ. У прафесійна-тэхнічныя вучылішчы зараз трапляюць самыя лепшыя. У ПТВ бытавога абслугоўвання, да прыкладу, прахадны бал атэстату складае 4,7 бала, а сярэдні конкурс — 4 чалавекі на месца. Шанс «троечнікаў» трапіць у прэстыжныя ПТВ практычна роўны нулю.

* * *

Вам не болей за сорак? Добра. У вас ёсць дыплом аб заканчэнні ВНУ (5 год)? Яшчэ лепш. Вы дасканала ведаеце англійскую мову? Выдатна. Вы кампетэнтны, прафесіянальны, ініцыятыўны? Вельмі выдатна. Аказваецца, вы здольны ўзяць удзел у адкрытым конкурсе па праграме стыпендый імя Эдмунда Маскі. Пераможцы атрымліваюць права 1—2 год навучання ў ЗША па наступных накірунках: кіраванне камерцыйнай дзейнасцю і дзяржаўнае кіраванне, юрыспрудэнцыя, эканоміка. Тэрмін падачы анкет — да 20 кастрычніка 1993 года. Тэлефануйце па мінскім тэлефоне 628-888, звяртайцеся: г. Мінск, вул. Сурганава, 15, пакой 11, навуковая бібліятэка імя Я. Коласа.

ЗАЛАТОЕ ПЯРО

Згуртаванне журналісцкіх радоў Беларусі — вось, бадай, галоўны лейтматыў 1-га фестывалю беларускай журналістыкі, які прайшоў у мінулую суботу ў Палацы моладзі. Арганізатарамі свята былі Саюз журналістаў рэспублікі Беларусь і пасольства Федэратыўнай рэспублікі Германія. Спонсарам фестывалю стала навукова-вытворчая кампанія «BITT», а прадзюсерам — фірма «HELEN VALERY Ltd». З прадстаўнікамі сродкаў масавай інфармацыі сустрэўся Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь Станіслаў Шушкевіч. На пытанні адказвалі Паўнамоцны Пасол Федэратыўнай Рэспублікі Германія ў Рэспубліцы Беларусь Альбрэхт Готфрыд, кіраўнікі нашых міністэрстваў і ведамстваў. Тэма прэс-канферэнцыі — «Грамадская свядомасць, дзяржаўная ўлада і прэса».

Сярод тых, хто прыйшоў на фестываль, былі і студэнты факультэта журналістыкі, многія з якіх ужо працуюць карэспандэнтамі ў беларускіх газетах і часопісах. А сярод ганаровых гасцей фестывалю прысутнічаў Алег Георгіевіч Слука, дэкан адзінага ў рэспубліцы факультэта, што рыхтуе кадры для сродкаў масавай інфармацыі.

ПЫТАННЕ РУБАМ

Я Б У ВНУ ПАЙШОЎ. ХІБА БЕЗ ПАДРУЧНІКА НАВУЧАЦЬ?

Хто са студэнтаў не ведае, як складана здаць экзамен ці залік без добрага падручніка. Але ў апошні час здараецца так, што знайсці такі падручнік у бібліятэцы немагчыма. І тады дапамагае літаратура, здабытая ў кніжных крамах. Але яны зараз гандлююць далёка не вучэбнай літаратурай. Застаецца апошняя надзея — на універсітэцкі кіёск.

— Што ён можа прапанаваць студэнтам? — пытаюся я ў прадаўца кіёска Антаніны Паўлаўны МОСІНАЙ.

— Гандлюем мы тымі ж выданнямі, якімі гадлююць усе кніжныя лаўкі горада. Падручнікаў вельмі мала. У асноўным гэта тое, што выходзіць у нашых мінскіх выдавецтвах. Маскоўскія ці якія іншыя падручнікі — вялікая рэдкасць. У Маскве падручнікі, увогуле, ужо ніхто не заказвае, таму што нават аплаціць іх вельмі складана.

— Здаецца, цэны ў вашы кіёску ніжэйшыя, чым у горадзе?

— Вузаўскі кніжны кіёск — гэта гаспадарча-разліковая структура, за ўсё нам прыходзіцца плаціць самім, а таму і цэны выстаўляць такія, каб пакрыць выдаткі. Яны ў нас не ніжэйшыя. Але студэнты — народ разумны і на добрую кнігу грошай не шкадуюць. На жаль, прапанаваць ім штосьці вартае мы можам вельмі рэдка.

— І няма ніякай розніцы, па якой спецыяльнасці патрэбны падручнік?

— Так. Разумнай кнігі не хапае студэнтам усіх факультэтаў: і філосафам, і філолагам, і гісторыкам. Па матэматыцы, да прыкладу, ужо каторы год нічога не атрымліваем. А навука развіваецца вельмі хутка, і падручнікі па матэматыцы, фізіцы, праграмаванню, якія выйшлі ў 1989 годзе, ужо лічацца састрэлымі і нікому не патрэбны.

Студэнты і выкладчыкі зараз адчуваюць сапраўдны інфармацыйны голад. Спецыялісты-сацыёлагі падлічылі, што калі такая сітуацыя з забеспячэннем рэспублікі вучэбнай і навуковай літаратурай працягнецца яшчэ 4 гады, то пачнецца дэградацыя.

У гэтым годзе ў Мінску закрыліся 3 вузаўскіх кіёскі. На іх месцы ўзніклі новыя камерцыйныя, якія ўвогуле не гандлююць падручнікамі. Яны хутка рэагуюць на попыт, маюць магчымасць самастойна дастаўляць літаратуру з Масквы. Прапаноўвалі ўступіць сваю плошчу і кіёску ў галоўным корпусе універсітэта. Але, здаецца, павінен хтосьці гандляваць не толькі масавай, але і навуковай літаратурай. А вузаўскія кіёскі напрацавалі ўжо пэўны вопыт, ведаюць спецыфіку і патрэбы сваіх кліентаў.

Вольга УЛЕВІЧ.

АДКАЗВАЕ МІНІСТР

***27 верасня газета «Звязда» праводзіла прамую лінію паміж чытачамі газеты і міністрам Міністэрства інфармацыі* Анатолем Іванавічам БУТЭВІЧАМ.**

— Ці плануецца ў бліжэйшы час выпуск падручнікаў для вышэйшай школы? — такое пытанне задаў міністру наш карэспандэнт.

— З друкам беларускамоўных падручнікаў асаблівых праблем няма. А вось з іх стварэннем (напісаннем) — вялікія цяжкасці. Паўстае пытанне: ці нам механічна перакладаць на беларускую мову расійскія падручнікі (з чым я не згодны), ці сваімі сіламі ствараць уласныя. Што значна складаней. Патрэбна вялікая дэталёвая праграма. На перспектыву такой дэталёвай праграмы няма, на бліжэйшыя часы ёсць. Рукапісы новых беларускіх падручнікаў не затрымліваюцца ў выдавецтвах, але іх вельмі мала. Здаецца, напісаць падручнік для вышэйшых навучальных устаноў, дзе яго аўтарамі могуць стаць самі выкладчыкі, прафесары, лягчэй, чым для сярэдняй школы. Але выкладчыкі заняты сваёй непасрэднай справай.

АКТУАЛЬНА

АД АБІТУРЫЕНТА ДА МАГІСТРА

Аб знешнім партрэце вышэйшай школы карэспандэнт газеты «Рэспубліка» гутарыць з начальнікам управлення ВНУ і педадукацыі Мінадукацыі Рэспублікі Беларусь Таццянай Яўгенаўнай Галко.

— Аптымальны варыянт спалучэння фундаментальнай тэарэтычнай падрыхтоўкі і спецыялізацыі — формула ВНУ, да якой мы імкнемся. Зрэшты, увесь свет шукае такога спалучэння. Напрыклад, у Германіі — праз стварэнне «фаххохшуле», у Англіі — «універсітэтаў прыкладных ведаў»... Але калі Захад ідзе да гэтай мадэлі ад універсітэтаў, звяртаючы ўвагу на разгортванне спецыялізацый, то наш мае процілеглы вектар — ад вузкаспецыялізаваных інстытутаў да шматпрофільных (універсітэцкага тыпу). Адным са станоўчых вынікаў такой палітыкі будзе пашырэнне адукацыйных паслуг для рэгіёнаў. Таму варта вітаць з'яўленне на Беларусі новых універсітэтаў, асабліва на перыферыі.

— А недзяржаўных ВНУ?

— Таксама. Іх, дарэчы, ужо каля дзесятка — Беларускі інстытут правазнаўства, Еўрапейскі гуманітарны універсітэт, камерцыйны інстытут прадпрымальніцкай дзейнасці, Мінская вышэйшая духоўная праваслаўная семінарыя і іншыя.

У іх распачалі вучобу звыш тысячы першакурснікаў, што складае каля пяці працэнтаў дзённага набору ў ВНУ дзяржаўнага сектара.

Праўда, ёсць акалічнасць, здольная стрымаць гэты працэс. калі яе своечасова не ліквідаваць. Сёння недзяржаўныя ВНУ маюць пад сабой фактычна толькі адзін прававы дакумент — аб іх ліцэнзаванні. Але ён дае права толькі на пачатак навучальнай дзейнасці — не больш. Яе выпускнікі не атрымліваюць дыпломаў дзяржаўнага ўзору, а таму шмат дзе не могуць быць прыняты на працу па спецыяльнасці. Міністэрства пайшло ім насустрач. Зараз распрацоўваецца яшчэ адзін юрыдычны дакумент — аб акрэдытацыі (атэстацыі) навучальных установ, у тым ліку — недзяржаўных. Прайшоўшы яе грунтоўны інспекцыйны кантроль па праграмах навучання, узроўню выкладання, якасці ведаў студэнтаў і г. д. — такія ВНУ становяцца ў адзін рад з дзяржаўнымі.

— Агульнапрызнана, што савецкай школе, у тым ліку вышэйшай, быў уласцівы тэхнакратычны характар. У выніку выпускнікі найперш тэхнічных ды прыродазнаўчых факультэтаў у пераважнай большасці мелі вельмі сціплае ўяўленне пра айчынную і сусветную літаратуру, мастацтва.

— Глабальныя праблемы, з якімі зараз сутыкаецца цывілізацыя, сведчаць аб тым, што вычарпаны рэзервы існавання чалавецтва на прынцыпах тэхнагеннасці. Невыпадкова афарызмам Захаду стала думка Клода Леві-Строса: «XXI стагоддзе будзе стагоддзем гуманітарных ведаў, калі яно будзе ўвогуле...»

Мы толькі ў апошнія гады ўсвядомілі нарэшце, што выпускнік нашай вышэйшай школы без ведання гісторыі і культуры свайго народа, сусветных філасофскіх дасягненняў і г. д. не можа быць паўнавартасным спецыялістам. Ліквідаваць тэхнакратычны ўплыў, уласцівы айчыннай адукацыйнай сістэме, дапаможа пашырэнне ў ёй вывучэння гуманітарных дысцыплін. Мяркуецца, што ў тэхнічных ВНУ яны складуць чвэрць усіх прапаноўваемых там ведаў, у гуманітарных — 35 працэнтаў.

— Якімі яшчэ новаўводзінамі ў беларускай вышэйшай школе вы хацелі б падзяліцца?

— Сярод важнейшых элементаў яе рэфармавання — пераход да шматузроўневай сістэмы адукацыі. Сэнс гэтага кроку звязаны з дыферэнцыяцыяй падрыхтоўкі спецыялістаў. Дагэтуль, як вядома, усе выпускнікі ВНУ атрымлівалі дыпломы аднаго ўзору. Зараз іх будзе чатыры. У першыя тры-чатыры семестры будуць вывучацца галоўным чынам агульнатэарэтычныя прадметы. Наступныя два-два з паловай гады прадугледжваюць прафесіяналізацыю студэнта, паспяховае завяршэнне якой будзе адзначана дыпломам аб вышэйшай атэстацыі і ступенню бакалаўра. Дыпломы трэцяга ўзору атрымаюць выпускнікі з паглыбленымі спецыялізаванымі ведамі. Чацвёртая ступень — магістр.

ВІДАВОЧНАЕ-НЕВЕРАГОДНАЕ

ЗА СЯБЕ І ТАГО ХЛОПЦА

Да нядаўняга часу Аляксей Палякоў быў звычайным вучнем 50 мінскай школы. Гэтым летам падштурхнула яго штосьці паступаць на спецыяльнасць «Псіхалогія» філасофска-эканамічнага факультэта БДУ. І тут падпільноўвала яго адна нечаканасць — у жаданай групе псіхолагаў ён аказаўся адзіным хлопцам.

— Аляксей, асэнсаванне таго, што ты адзіны хлопец ў групе, цябе абрадавала, засмуціла ці напужала?

— Хутчэй здзівіла. Пакуль ішлі ўступныя экзамены, я не заўважаў, што сярод абітурыентаў хлопцаў толькі чацвёра. Калі заўважыў, было ўжо позна. Бацькі сказалі, што хутка ажанюся.

— А зараз ты кім адчуваеш сябе ў групе: цэнтрам увагі ці адзінотнікам?

— Цэнтрам ўвагі — так. Але і адзінотнікам таксама. Я нават задумваўся, што калі ў групе з'явіцца яшчэ адзін хлопец, і палова ўвагі прыпадзе на яго плечы...

— Навошта? Такому становішчу, напэўна, зайздросцяць усе твае сябры. *Аляксей, а кім ты збіраешся стаць пасля заканчэння ўніверсітэта?*

— Сур'ёзна я аб гэтым яшчэ не думаў. Ведаю дакладна, што буду займацца псіхалогіяй. Спецыяльнасць мне вельмі падабаецца. Для гэтага я, ў рэшце рэшт, і паступаў.

— Мне здаецца, табе лёсам наканавана стаць спецыялістам па жаночай псіхалогіі...

— Ну, спецыялістам не спецыялістам... А запоўніць прабелы ў адносінах са слабым полам атрымаецца, мяркуючы па ўсяму, выдатна.

Вось так. Аказваецца вучоба ў дзявочым калектыве ніколькі не перашкаджае, а наадварот — спрыяе навучальнаму працэсу. І зусім не страшна быць адзіным хлопцам-псіхолагам на ФЭФе.

Магчыма, англійскім майстрам пазайздросціў бы і рускі леўша. А зрэшты, што ім дзяліць? Адзін падкаваў блаху, другія — дадумаліся да стварэння маленечкага цягніка, які размясціўся ў арэхавым шалупінні.

Пра новую стэнаграфію і новы машынапіс

На факультэце грамадскіх прафесій наш карэспандэнт сустрэўся з выкладчыкам стэнаграфіі і машынапісу У. В. ГЕРАСІМАВЫМ:

— Курсы стэнаграфіі пры факультэце грамадскіх прафесій працуюць даўно. Спачатку выкладалася сістэма Сакалова. Студэнты займаліся, як памятаю, два разы на тыдзень па дзве гадзіны. А тэрмін навучання быў два гады. Здаралася, што да канца першага года навучэнцы губляліся ўпэўненасць у сваіх сілах, ужо не верылі, што калісьці ўдасца авалодаць гэтым пісьмом. А потым вы прапанавалі выкладаць стэнаграфію за адзін год...

— Так, за адзін. І займаліся не чатыры гадзіны на тыдзень, а толькі адну. Я заўважыў, што другая гадзіна прыносіла вельмі малую карысць. Мы ж займаліся ў другую змену. А ўранку студэнт не ў парку гуляў — на лекцыях карпеў. Пасля гэтага яму цяжка засяроджваць увагу на чымсьці яшчэ дзве гадзіны.

— Атрымліваецца, вы скаракцілі тэрмін навучання ў восем разоў.

— І тым не менш, студэнты добра засвойвалі ўвесь курс стэнаграфіі. Вялікую хуткасць за такі кароткі тэрмін набыць, вядома, нельга. Трэба пачынаць стэнаграфаваць лекцыі, тады і хуткасць будзе.

— Але ж як атрымалася скараціць тэрмін навучання? Можа, якія-небудзь новыя педагагічныя прыёмы рас працавалі?

— Не гэта галоўнае. Калі сістэма стэнаграфіі вельмі складаная, то ніякія педагагічныя хітрыкі не дапамогуць. У першую чаргу, сістэма стэнаграфіі павінна быць простай, даступнай. А потым ужо трэба думаць, як лепей падаць яе.

— Чым адрозніваецца, у такім выпадку, ваша сістэма ад іншых?

— Такое пытанне многія задаюць. Вось атрымалі аднойчы ліст ад настаўніка А. М. Воранава: «Многія вучні нашай школы займаюцца завочна на курсах стэнаграфіі пры універсітэце. Некаторыя ўжо спрабуюць стэнаграфаваць тлумачэнні настаўнікаў. Спачатку павольна пісалі, а цяпер амаль слова ў слова. І цыдулкі адзін аднаму пішуць, і зусім не баяцца, калі настаўнік заўважыць: усё роўна не прачытае. І сапраўды, ні адзін настаўнік у нас не ведае стэнаграфіі. А мы ж калісьці спрабавалі авалодаць хуткім пісьмом, ды не давалася яно. Чаму цяпер так лёгка вывучаюць стэнаграфію нават сямікласнікі? Можа гэта нейкая новая сістэма?»

Здагадка настаўніка правільная, мы выкладаем новую сістэму. Называем яе займальнай, рытмічнай, простай.

— Займальная стэнаграфія — гэта накшталт займальнай геаметрыі?

— Не, не так. «Займальная геаметрыя» — дадатак да падручніка геаметрыі для тых, хто добра авалодаў матэрыялам падручніка, але хоча штосьці яшчэ даведацца. А займальная стэнаграфія — ніякі не дадатак, а сам падручнік. Толькі напісаны займальна. Стэнаграфію лепей вывучаць у школьныя гады. У нас нават вучні шостага класа займаюцца. Зрэдку і пяцікласнікі паступаюць. Вось чаму мы імкнуліся зрабіць падручнік цікавым. Але ж займальнасць і дарасламу не пашкодзіць.

— А чаму рытмічная? Такая назва нагадвае рытмічную гімнастыку...

— Есць сістэмы, якія прымушаюць пяро мітусіцца занадта. Ніякага рытму, а ўсё нейкія канвульсіі. Сістэма Сакалова, якую раней выкладалі на факультэце, была больш рытмічнай за іншыя. Гэтай сістэме падыходзіў тады эпітэт «рытмічная». Але ж цяпер не адпавядае ён яе сутнасці.

— Цікава, чаму?

— У параўнанні з нашай сістэмай яна аказваецца зусім не рытмічнай.

— Ці можаце больш падрабязна растлумачыць, што значыць рытмічная стэнаграфія?

— Пішыце звычайныя літары: ее. Пішуцца яны проста, рытмічна. А цяпер напішыце некалькі разоў: еэ, еэ, еэ...

Адчуваеце, пераход ад літары Е да літары Э больш складаны. Пяро вымушана тут трошкі прытармазіць. Знікае хуткасць пісьма, парушаецца рытм.

У нашай сістэме стэнаграфіі не так часта, як у сістэме Сакалова, сустракаюцца спалучэнні падобныя на ЕЭ. Часцей за ўсё ў нас такія спалучэнні, як ЕЕ. Адсюль і больш высокая рытмічнасць.

— Па гэтай прычыне, напэўна, вашу сістэму называюць простай? Рытмічныя, простыя злучэнні маюцца на ўвазе?..

— Так, сістэма, простая на пісьме. Аднак маецца на ўвазе не толькі простае пісьмо. Тэорыя ў нас даступная. Наша сістэма ў два-тры разы прасцей за іншыя: у ёй усяго каля 50 знакаў. Дарэчы, на пішучай машынцы таксама каля 50 клавішаў. Але ўявіце, што іх у тры разы болей — 150. Хто змог бы авалодаць машынапісам? На шчасце, такіх машынак няма. А вось стэнаграфічныя сістэмы ёсць. Таму настаўнік Воранаў і не здолеў у свой час авалодаць стэнаграфіяй. Але ж цяпер, гледзячы на школьнікаў, многія настаўнікі пачынаюць вучыцца ў нас. Канешне, набіраць хуткасць у іх няма магчымасці: студэнцкія гады даўно ўжо скончыліся, але ж давесці яе да 60 слоў за мінуту зусім не цяжка. А гэта ўсё ж такі ў тры разы хутчэй, чым пісаць звычайным пісьмом.

Настаўнікам і студэнтам старэйшых курсаў, якія восьвось пачнуць працаваць у школе мы так тлумачым: стэнаграфію вывучайце абавязкова. Вялікая хуткасць тут не вельмі патрэбна. Галоўнае, каб свае разважанні запісаць і прачытаць потым. Ды й такое меркаванне немалаважнае: школьнікі ўмеюць стэнаграфаваць, а вы не ўмееце. І як жа тут заваяваць аўтарытэт у тых жа сямікласнікаў? Вы, вядома, можаце крыўдзіцца на нас за тое, што навучылі вашых школьнікаў стэнаграфіі...

Студэнтам малодшых курсаў можна вельмі хутка засвоіць тэорыю — усяго за адзін семестр. І потым практыкавацца некалькі гадоў. Да пятага курса можна такую хуткасць набраць!

— Хацелася б ведаць і пра вашы планы на гэты навучальны год.

Па-першае, трэба падрыхтаваць артыкул пра тое, як звычайнае пісьмо можна зрабіць больш хуткім. Некаторыя законы стэнаграфіі можна прымяніць у звычайным пісьме. Лічаць. што безадрыўнае пісьмо больш хуткае. Гэта не заўсёды так. Калі пяро адрываецца ад паперы, рука адпачывае. І піша потым хутчэй. Але і тут існуюць свае правілы, пра якія і трэба расказаць.

Другая тэма — студэнцкая стэнаграфія. Многія выпускнікі нашых курсаў даўно ўжо сталі студэнтамі, стэнаграфуюць лекцыі. На юрыдычным факультэце займаецца Алена Суворава, на мехмаце — Наталля Муштанава, на філасофска-эканамічным факультэце Дзіна Палтаржыцкая, скончыла педагагічны інстытут Вольга Акуліч, ёсць нашы выпускнікі і ў іншых ВНУ. Гледзячы на іх, спрабуюць падвучыць стэнаграфію іншыя студэнты. Але ж часу не маюць, каб добра засвоіць усю тэорыю. І задумаліся: пераймаюць у нашых выпускнікоў не ўсю тэорыю, а толькі частку. І вельмі вялікую маюць выгоду, замяняючы канчаткі слоў стэнаграфічнымі знакамі. Пакуль пачатак слова пішацца звычайнымі літарамі, дык паспяваеце ўспомніць стэнаграфічны знак для канчатка.

Зараз нам трэба распрацаваць падручнік па такой стэнаграфіі.

А трэцяя наша тэма — машынапіс. З гэтага года мы пачалі яго выкладаць. І ён у нас, дарэчы, таксама новы. Методыку, якую выкладаюць амаль ва ўсіх падручніках, я называю «методыкай выкручвання рук», альбо методыкай «для ластаногіх». Уяўляеце: рукі ў машыністкі вывернуты ўбакі (ну, як ласты ў цюленя). Гэта нязручна. Па нашай методыцы — рукі прамыя, клавіятура засвойваецца хутчэй, пальцы больш упэўнена трапляюць на «свае» клавішы. Курс навучання ў нас 40 гадзін. У іншых — на сто гадзін больш.

І такі падручнік мы зараз складаем.

БУДЗЬЦЕ ПІЛЬНЫМІ!

ЯКІ ЗЛАЧЫНЦА БЕЗ ПАМАГАТЫХ?

Напружаная сацыяльна-эканамічная абстаноўка, якая склалася ў цэлым па рэспубліцы, адмоўна адбіваецца на стане злачыннасці ў Мінску. За восем месяцаў бягучага года назіраецца яе далейшы рост, здзейснена 10 882 злачынствы. Найбольшая іх колькасць зарэгістравана ў Маскоўскім раёне.

Гаворачы аб злачыннасці, трэба адзначыць, што па-ранейшаму яе дынаміку вызначаюць крадзяжы. Асабліва вострая сітуацыя складваецца з крадзяжамі з кватэр. Іх колькасць ў бягучым годзе вырасла на 70 працэнтаў. Крыўдна, што ў большасці выпадкаў здзяйсненню гэтых правапарушэнняў садзейнічаюць самі пацярпеўшыя. Гэта і адсутнасць элементарнай пільнасці, і нават наогул невытлумачаныя паводзіны. Міліцыя мае мноства прыкладаў, калі людзі запрашаюць да сябе ў госці першых выпадковых сустрэчных, а потым не знаходзяць ні гасцей, ні многіх рэчаў. У аналагічныя сітуацыі трапляюць і гаспадары, якія прадастаўляюць жыллё невядомым.

Аналіз крадзяжоў з кватэр паказвае, што значная іх колькасць здзейснена шляхам узлома дзвярэй, вокнаў, балконаў і фортак кватэр, якія размешчаны на першых паверхах, падбора ключэй. У мэтах папярэджання крадзяжоў рэкамендуем замацаваць дзверы дадатковымі замкамі павышанай сакрэтнасці, устанавіць падвойныя дзверы, якія б адчыняліся наружу. Лоджыі і балконы першых паверхаў закрыць кратамі, не пакідаць адчыненнымі форткі і балконныя дзверы ў адсутнасць гаспадароў кватэры.

Магчыма, крадзяжы з кватэр вам дапамогуць папярэдзіць сродкі ахоўнай сігналізацыі.

У аператыўных зводках міліцыі часта паведамляецца аб крадзяжах з кабінетаў і іншых службовых памяшканняў прадпрыемстваў, арганізацый і ўстаноў.

Аналіз гэтага тыпу крадзяжоў паказвае, што здзяйсняюцца яны з выкарыстаннем разявацтва саміх супрацоўнікаў. Злачынца нават не абцяжарвае сябе падборам адмычак да замкоў, не ламае дзверы. Іх проста пакідаюць адчыненымі, выходзячы на пяць хвілін у суседні кабінет, пакурыць, па выкліку начальства самі пацярпеўшыя. Гэтага часу дастаткова, каб... выкрасці тэлефонны апарат, вопратку ці грошы з сумачкі, што засталася вісець на спінцы крэсла, а таксама ключы ад кватэры, каб праз гадзіну здзейсніць крадзеж з кватэры.

Э. ПЕТРАШЭЎСКІ,
намеснік начальніка аддзялення аховы грамадскага парадку і прафілактыкі Маскоўскага РАУС г. Мінска.

СТУДЫЁН

НОВЫ ЧЭМПІЁН — МЕХМАТ

Хутка пачнецца чарговая універсітэцкая Спартакіяда, а вынікі папярэдняй многім з вас невядомыя. Кіруючыся правілам: лепей позна, чым ніколі, паведамляем...

У маі прайшлі спаборніцтвы па чатырох відах спорту.

ГІРЫ. Тут першынствааў факультэт радыёфізікі і электронікі. Другім і трэцім сталі механіка-матэматычны і юрыдычны факультэты.

ЛЕГКАЯ АТЛЕТЫКА. Тройка прызёраў выглядае наступным чынам: фізфак, ФПМІ, ФЭФ.

СПАРТЫЎНАЕ АРЫЕНТАВАННЕ. Мацнейшымі былі студэнты ФПМІ. Крыху спазніліся географы і мехматаўцы.

ФУТБОЛ. Мехмат заняў першае месца, факультэт радыёфізікі і электронікі — другое, ФПМІ — трэцяе.

Такім чынам, канчатковая табліца універсітэцкай Спартакіяды набыла такі выгляд (у дужках колькасць набраных ачкоў):

1. Мехмат (445)
2. ФПМІ (435)
3. Геафак (375)
4. Фізфак (354)
5. Факультэт радыёфізікі і электронікі (343).
6. Юрфак (337)
7. ФЭФ (283)
8. Біяфак (266)
9. Гістфак (235)
10. Хімфак (222)
11. Філфак (218)
12. Журфак (212)

Студэнты ФПМІ, як мы і прадугледжвалі, не далі спакойнага жыцця мехматаўцам. Атрымалася ўрэшце рэшт так, што пераможца футбольнай сустрэчы ФПМІ-мехмат аўтаматычна станавіўся і чэмпіёнам Спартакіяды. Студэнты мехмата кінулі ўсе свае мацнейшыя сілы — упускаць агульную перамогу пасля года лідэрства было вельмі крыўдна. І свайго дабіліся, атрымаўшы перамогу і ў турніры футбалістаў, і ў Спартакіядзе. З чым мы іх і віншуем!

Каментарый да выступлення каманды-пераможцы дае адказны за фізвыхаванне на ММФ **Анатоль Сяргеевіч БАЛДЗІН:**

— Агульная перамога — вынік той вялікай арганізацыйнай работы, што прайшла на факультэце. Адбор спартсменаў на Спартакіяду адбываўся па выніках унутрыфакультэцкіх стартаў. Адыграў сваю станоўчую ролю і фактар матэрыяльнага стымуліравання спартсменаў, дзякуючы якому ўдалося сабраць усіх мацнейшых. Хацелася б адзначыць некаторых спартсменаў: плаўца Дзмітрыя Камяноўскага, які на сённяшні дзень з'яўляецца першым нумарам беларускай зборнай; студэнта з Конга Жана Банузі, плаўчыху Аксану Аўсюкевіч; валейбалістаў Алісіевіча, Русака і Дужа.

Трэба сказаць добрыя словы ў адрас дэкана факультэта Леаніда Платонавіча Прымачука і яго намеснікаў, якія са свайго боку зрабілі ўсё магчымае, каб каманда выступіла як мага лепей.

Нялёгка далася нам перамога. Пэўна, яшчэ цяжэй будзе даказаць, што наш поспех быў невыпадковым.

Алесь СПАРТЫЎНЫ.

ВЕДАЙ НАШЫХ!

ЯШЧЭ АДЗІН МЕДАЛЬ КАМАНДАРА МАДЖЫДАВА

Малайчына Камандар! У які раз даказаў і сабе, і ўсяму свету, што ягоны патэнцыял спартсмена яшчэ далёка не вычарпаны.

На першынстве свету па грэка-рымскай барацьбе, якое завяршылася ў Стакгольме, К. Маджыдаў у сваёй вагавай катэгорыі заваяваў сярэбраны медаль. У фінальным паядынку ён ва ўпартай барацьбе ўступіў усё ж такі расійскаму атлету І. Дакучыеву, які з'яўляецца ўжо каторы год галоўным сапернікам Камандара, паядынкі паміж імі праходзяць з пераменным поспехам. На гэты раз шчасце было на баку расіяніна.

А. ЮРЫН.

ГЭТА БУДЗЕ, БУДЗЕ...

27 верасня кросам першых курсаў пачынаецца штогадовая Спартакіяда Белдзяржуніверсітэта.

Далей пройдуць спаборніцтвы па міні-футболу. Сёлетняя Спартакіяда мала чым адрозніваецца ад папярэдняй. Праўда, ***плануецца*** спаборніцтвы па некаторых відах спорту правесці пад час веснавога фестывалю студэнтаў у Вязынцы. Магчыма, гэта будзе гіравы спорт, спартыўнае арыентаванне і некаторыя іншыя.

Павінны адбыцца змены і ў арганізацыі Спартакіяды сярод каманд ВНУ Беларусі. Цэнтр студэнцкай моладзі, які ўзяў на сябе правядзенне Спартакіяды, збіраецца праводзіць яе з канчатковым агульнакамандным залікам. Плануецца, што будзе немалы прызавы фонд (што ў сваю чаргу, несумненна павысіць колькасць удзельнікаў. Універсітэт выступіць па 24 відах спорту і будзе змагацца за агульнакамандное другое месца. Першае месца ўжо загадзя аддадзена Акадэміі фізвыхавання і спорту. Змагацца з ёй на роўных наўрад ці камусьці пад сілу.

Фінансавыя цяжкасці не дазволілі нам заявіць жаночую баскетбольную каманду ***на першынства рэспублікі. Заявачны ўзнос, камандзіровачныя патрабуюць значнай*** сумы грошай, якой сёння універсітэт не мае.

В. ПЯТРОЎСКІ,
старшыня спартыўнага клуба.

ГАРМОНІЯ СІЛЫ

З гэтага выпуска «Студыёна» рэдакцыя «БУ» плануе рэгулярна прапаноўваць разнастайныя сістэмы практыкаванняў, якія дазволяць вам падтрымліваць сваю фізічную форму. Сёння мы пагаворым пра трэніроўкі на трываласць.

Трываласць можна разглядаць як своеасаблівы запас сілы і хуткасці, якія знаходзяцца ў пэўнай узаемазалежнасці. Аснова трываласці — працаздольнасці сардэчна-сасудзістай і дыхальнай сістэм. Таму трывалы чалавек заўсёды можа кампенсаваць некаторы недахоп фізічнай сілы шляхам рацыянальнага выкарыстання сваіх магчымасцей. Трэніраваць трываласць — гэта, перш за ўсё, трэніраваць сэрца, крывяносныя сасуды і лёгкія.

Для выпрацоўкі трываласці выкарыстоўваюцца практыкаванні, якія выклікаюць стомленасць. Павышаючы інтэнсіўнасць нагрузак, арганізм паступова будзе пераходзіць на ўсё больш высокі ўзровень фізічнага развіцця.

Для развіцця агульнай трываласці практыкуюць нагрузкі сярэдняй інтэнсіўнасці. Гэта, перш за ўсё, цыклічныя практыкаванні, на працягу якіх адны і тыя ж простыя практыкаванні паўтараюцца шматразова: бег, хадзьба, лыжныя гонкі, плаванне, язда на веласіпедзе.

Добра развіваюць аэробныя магчымасці спартыўныя гульні, калі перыяды інтэнсіўных рухаў чаргуюцца з малой актыўнасцю.

Трываласць і сіла эфектыўна развіваюцца метадам КРУГАВОЙ ТРЭНІРОЎКІ, калі ў пэўнай паслядоўнасці вы выконваеце канкрэтныя заданні па кожнаму «прыпынку» у серыях па кругу. За практыкаваннем пасля непрацяглага адпачынку, скажам, для супакаення дыхання, наступае чарговае. Так дасягаецца бесперапыннасць і разнастайнасць уздзеяння літаральна на ўсе часткі арганізма.

Колькасць кругоў залежыць ад узроўня трэніраванасці і вызначаецца індывідуальна. Тыя, хто толькі пачынае, выконваюць па аднаму падыходу ў кожнай групе практыкаванняў, паступова павялічваючы аб'ём да двух і трох кругоў.

КОМПЛЕКС КРУГАВОЙ ТРЭНІРОЎКІ

1. Лёгкі бег — 30 секунд.
2. Нахілы наперад-назад — 20 разоў.
3. Адціскание ад падлогі — 15 разоў.
4. Лёгкі бег — 40 секунд.
5. Нахілы ў бакі — 20 разоў.
6. Падцягванне на перакладзіне — 10 разоў.
7. Прысяданні на правай назе — 15 разоў.
8. Прысяданні на левай назе — 15 разоў.

Адпачынак паміж практыкаваннямі 15-20 секунд, паміж серыямі — 4-5 хвілін. Усяго выконваць тры-чатыры серыі.

Трэніраваць трываласць вялікіх мышачных груп вам дапаможа мадыфікаваны тэст Х. Бубэ:

1. Адціскацца ад падлогі на працягу адной хвіліны.
2. Лежачы на спіне, падымаць і апускаць верхнюю частку тулава на працягу адной хвіліны.
3. У тым жа становішчы падымаць ногі да прамога вугла (калені не згібаць).
4. Прысядаючы на адной назе, згібаць і разгібаць апорную нагу на працягу 30 секунд.
5. Лежачы на жываце, падымаць ногі на працягу 30 секунд.

Жадаючы поспехаў у вашых трэніроўках і сачыце за наступнымі выпускамі «Гармоніі сілы».

ТРЫВАЛАСЦЬ — ГАРАНТЫЯ ДОБРАГА САМААДЧУВАННЯ

«СПАЛДЫНГ» АДКРЫВАЕ Ў МІНСКУ МАГАЗІН І... БАСКЕТБОЛЬНУЮ ЛІГУ

Летам у Мінску прайшла прэзентацыя вядомай у спартыўным свеце фірмы «Спалдынг», якая займаецца вытворчасцю спартыўнага адзення і тавараў. Ужо адкрыты і магазін гэтай фірмы па вуліцы Леніна.

Сумесна з Федэрацыяй баскетбола Беларусі фірма арганізавала і правяла першыя спаборніцтвы летняй аматарскай баскетбольнай лігі. Турнір праходзіў у трох катэгорыях: мужчынскай, жаночай і юнацкай. У дзвюх апошніх прымалі ўдзел каманды Белдзяржуніверсітэта.

Сярод шасці жаночых каманд баскетбалісткі БДУ былі другімі. У юнацкім турніры універсітэт прадстаўляла каманда нашага ліцэя. Яна была пятай сярод шасці каманд.

Па заканчэнні турніра спартсменам было ўручана шмат прызоў. Іх уладальнікамі сталі і баскетбалісты нашых каманд. Н. Ткачова атрымала прыз самай выніковай баскетбалісткі, набраўшы за час турніру 129 ачкоў. Яна ж паказала найвялікшую выніковасць (44 ачкі) у адной сустрэчы. Лепшай была па паказчыках штрафных кідкоў — восем з васьмі! Дарэчы, яе дачка Яўгенія была самай маладой баскетбалісткай турніру. У свае адзінаццаць год яна выступала разам з вопытнымі баскетбалісткамі, сярод якіх былі нават алімпійскія чэмпіёнкі. У камандзе БДУ была і самая старэйшая баскетбалістка жаночага турніру — Л. Сныціна.

Вось такім аказаўся дэбют летняй аматарскай баскетбольнай лігі на Беларусі. Амерыканскі бок застаўся задаволеным яго правядзеннем, і ўжо пачата падрыхтоўка да наступнага, які абяцае быць больш прадстаўнічым, яшчэ лепей арганізаваным, а значыць, і больш цікавым.

Аляксандр ЮРЫН.

На кароткай дыстанцыі

Паступова мяняе сваё аблічча універсітэцкі стадыён. Праўда, сёння немагчыма яшчэ прадказаць, калі ён нарэшце будзе ўведзены ў строй. Хаця па словах старшыні спартыўнага клуба Віктара Іванавіча Пятроўскага, будаўнічая арганізацыя абавязалася закончыць работы да пачатку гэтага навучальнага года, далей за словы справы не пайшлі. Аднак, кінуўшы позірк на асфальтавыя бегавыя дарожкі і практычна пабудаваныя трыбуны, можна спадзявацца, што спартсменам БДУ не давядзецца чакаць абяцанага яшчэ тры гады.

Тым часам заняткі па фізвыхаванню ніхто не адмяняў. З-за неўладкаванасці ўласнай спартыўнай базы даводзіцца арэндаваць стадыён «Дынама». Хоць і каштуе гэта вялікіх грошай. Але студэнты, відаць, толькі задаволены. Па-першае, якасцю і прэстыжнасцю спартыўнага збудавання. Па-другое, магчымасцю бясплатна наведаць рэчавы кірмаш, які працуе па суседству.

Нават саману трываламу цярпенню прыходзіць канец. Колькі часу, здароўя і намаганняў прыклала Людміла Канстанцінаўна Артамонава, адказная за фізвыхаванне на журфаку, каб студэнты-журналісты не былі хлопчыкамі для біцця на універсітэцкіх спаборніцтвах. І часам яе намаганні прыносілі свой плён: бываў журфак і пераможцам па некаторых відах спорту, і прызёрам. Але апошнім часам студэнты настолькі абыякава ставіліся да спорту, што альбо зусім не прыходзілі на спаборніцтвы, альбо выступалі пад час іх без бачнага энтузіязму. Вынік — апошняе месца на прайшоўшай Алімпіядзе.

Сёння выдатны выкладчык Л. К. Артамонава ўжо не выкладае на журфаку: адмовілася па ўласнаму жаданню. Шкада.

Адбыліся перамены ў футбольнай гаспадарцы універсітэта.

Былы трэнер універсітэцкай каманды Віталь Данілавіч Ліштван перайшоў на агульнаадукацыйную работу. Яго месца заняў Анатоль Данілавіч Дзядзюля.

ПЕРШАЯ ШЭЙПІНГ-МАДЭЛЬ

Так, гэта яна, Вольга Кавалеўская (прывабная дзяўчына пад парасонам) наехала ў Сеул на конкурс прыгажосці «Міс-свету — універсітэт».

Такой прыгожай і лепшай сярод лепшых яна стала, дзякуючы свайму трэнеру Тацяне Вежбіцкай (на здымку — справа). А вось за магчымасць прыстойна выглядаць на конкурсе Вольга павінна быць удзячнай Беларускай федэрацыі шэйпінгу. Згадзіцеся: 285 тысяч рублёў за народны касцюм, 82 тысячы — за вячэрнюю сукенку и па 60 тысяч — за кожную пару чаравікоў — для студэнткі такія выдаткі не па кішэні.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

220079, 1-ы Загарадны зав., 3.

Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МППА

30 верасня
Зак. 1708.
Т. 1000 экз.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ. 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.

Рэдактар
М. Г. ЗАГОРСКАЯ.